# НЕ ЗГАСНЕ Ў ВЯКАХ ПОДЗВІГ НАРОДА

## *Прамова Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР таварыша Ф. А. СУРГАНАВА*

Дарагія таварышы і сябры!

З пачуццём радасці і хвалявання сабраліся мы сёння на гэтай свяшчэннай зямлі, дзе ў гады гітлераўскага нашэсця ветэраны слаўнай партызанскай брыгады імя Чкалава праклалі свае першыя баявыя сцежкі. Сустрэчы з сябрамі заўсёды прыемныя. Але асаблівую радасць адчуваеш, калі сустракаешся з таварышамі па зброі, з тымі, хто ў барацьбе супраць лютых ворагаў праявіў сыноўскую вернасць сацыялістычнай Айчыне, непахісную волю да перамогі, жалезную стойкасць, мужнасць і адвагу.

Сёння памяць сэрца вяртае кожнага з нас да грозных падзей Вялікай Айчыннай вайны. У дні, калі над нашай Радзімай навісла смяротная небяспека, свет стаў сведкам небывалага ў гісторыі масавага подзвігу савецкіх людзей, які працягваўся з першага выстралу на заходніх граніцах краіны і да пераможнага залпа ў логаве фашысцкага звера.

Нашы ворагі за рубяжом да гэтага часу не могуць зразумець, адкуль савецкі чалавек чэрпаў сілы, каб выстаяць і перамагчы ў самай жорсткай і знішчальнай з усіх войнаў, якія толькі ведала гісторыя. Яны не ў стане зразумець таго бясспрэчнага факта, што гэта была перамога сацыялістычнага грамадскага і дзяржаўнага ладу, навуковай марксісцка-ленінскай ідэалогіі, сацыялістычнай маралі.

На абарону вялікіх заваёў Кастрычніка, свайго сацыялістычнага ладу жыцця савецкія людзі ішлі, натхняемыя выпрабаваным правадыром — роднай Камуністычнай партыяй, якая згуртавала фронт і тыл у адзін баявы лагер, была арганізуючай і накіроўваючай сілай агульнанароднай барацьбы з захопнікамі.

Наша рэспубліка разам з іншымі брацкімі рэспублікамі прыняла на сябе ўдар вераломных агрэсараў. Цяжкія выпрабаванні выпалі на долю беларускага народа. Але ён не скарыўся ворагу. У самыя цяжкія дні вайны, у самыя крытычныя моманты савецкія людзі былі ўпэўнены ў перамозе свайй справядлівай справы. У бітве з фашызмам асабліва ярка праявіліся выдатныя якасці нашага народа, выхаваныя партыяй, — вернасць ленінскаму сцягу, палымяная любоў да сацыялістычнай Радзімы, непахісны воінскі дух, бяспрыкладныя храбрасць і гераізм.

Звыш мільёна воінаў-беларусаў змагаліся з захопнікамі ў радах Савецкай Арміі на ўсіх франтах Вялікай Айчыннай вайны. А на акупіраванай тэрыторыі рэспублікі больш чым тры гады палала, не сціхаючы ні на адну мінуту, полымя ўсенароднай партызанскай барацьбы. Па закліку сэрца і патрыятычнага абавязку згуртоўваліся савецкія людзі ў падпольныя групы, стваралі атрады народных мсціўцаў, знішчалі жывую сілу і тэхніку ворага. Гарэла зямля пад нагамі фашысцкіх акупантаў. Кожная яе пядзя стала арэнай гераічнай барацьбы з захопнікамі.

Тут, у лясах пад Мінскам, адкрыў свой баявы рахунак партызанскі атрад Якава Захаравіча Дука і Івана Пятровіча Казака. У чэрвені 1942 года атрад І. П. Казака аб'яднаўся з партызанскім атрадам І. П. Кузняцова. На базе гэтага буйнога атрада сфарміравалася грозная партызанская брыгада імя Чкалава. Камандаваў ёю з першага і да апошняга дня баявых дзеянняў былы афіцэр Савецкай Арміі Міхаіл Іванавіч Грыбанаў, а камісарам быў Іван Пятровіч Казак. Таварышы Грыбанаў і Казак удзельнічаюць у нашым сённяшнім мітынгу.

Тры дзесяцігоддзі, якія мінулі з пачатку ўтварэння буйных партызанскіх атрадаў, брыгад і злучэнняў, мы па праву адзначаем як знамянальную дату. Усенародны партызанскі рух аказаў вялікую дапамогу Савецкай Арміі ў перамозе над ворагам. За тры гады барацьбы на акупіраванай тэрыторыі толькі беларускія партызаны знішчылі каля паўмільёна фашысцкіх салдат і афіцэраў, разграмілі многія сотні гарнізонаў і штабоў праціўніка, вывелі са строю вялікую колькасць варожай тэхнікі.

Брыгада імя Чкалава, што ўваходзіла ў састаў Баранавіцкага злучэння, у якім налічвалася звыш 30 тысяч узброеных байцоў, дзейнічала ў вялікім партызанскім краі — былой Баранавіцкай вобласці. Камандаваў злучэннем сакратар падпольнага абкома КПБ, Герой Савецкага Саюза В. Е. Чарнышоў. Партызаны-чкалаўцы самаадданa змагаліся з гітлераўскімі захопнікамі. Удзельнікі сённяшняй сустрэчы памятаюць, як разам са сваімі баявымі таварышамі яны пускалі пад адхон варожыя эшалоны, узрывалі і спальвалі масты, склады, грамілі камендатуры і атрады карнікаў, зрывалі ваенныя, палітычныя і гаспадарчыя мерапрыемствы акупантаў. Байцы брыгады вывелі са строю больш чым 10 тысяч гітлераўцаў. Адзін толькі гэты факт пераканаўча сведчыць аб воінскіх заслугах чкалаўцаў.

Наша сустрэча праходзіць напярэдадні свята вызвалення рэспублікі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Дваццаць восем гадоў назад, у такія ж гарачыя чэрвеньскія дні, гераічная Савецкая Армія разгарнула пры актыўнай падтрымцы партызан і ўсяго народа грандыёзную Беларускую наступальную аперацыю. Гэта была адна з выдатных бітваў другой сусветнай вайны, якая завяршылася сакрушальным разгромам буйной групоўкі гітлераўскіх войск і вызваленнем Беларускай ССР. У бітве за Беларусь ярка праявіліся неадольная магутнасць нашай пераможнай арміі, мужнасць і доблесць яе байцоў і камандзіраў, палкаводчы талент военачальнікаў.

Савецкая Армія, знішчыўшы гітлераўскую ваенную машыну, адстаяла гонар і незалежнасць сацыялістычнай Радзімы, вялікія рэвалюцыйныя заваёвы савецкага народа, вызваліла народы Еўропы ад фашысцкага рабства.

Адной з невычарпальных крыніц, адкуль савецкія людзі чэрпалі сілы для перамогі над ворагам, была непарушная дружба народаў нашай шматнацыянальнай Радзімы. Завешчаная вялікім Леніным, выкаваная Камуністычнай партыяй, яна ў жорсткай бітве з фашызмам яшчэ больш загартавалася і ўзмацнела. У год 50-годдзя ўтварэння калыскі і апоры дружбы нашых народаў — магутнага Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік мы з асаблівым пачуццём любві і ўдзячнасці ўспамінаем нашых братоў па зброі — рускіх, украінцаў, грузін, армян, казахаў, башкір, літоўцаў, латышоў — прадстаўнікоў больш чым 70-ці нацыянальнасцей краіны, якія мужна змагаліся з акупантамі ў беларускіх падпольных арганізацыях, партызанскіх атрадах, брыгадах і злучэннях. Гэта была сапраўды інтэрнацыянальная армія, якая ўвасабляла непарыўнае адзінства новай гістарычнай супольнасці людзей — вялікага савецкага народа.

Нацыянальная бібліятэка Рэспублікі Беларусь

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы